Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
_________ Н.У.Карчэўская
27 красавіка 2026 г.
Рэгістрацыйны № ВД-7-78 / эвуч.

# ЗАКАНАДАЎСТВА Ў ГАЛІНЕ МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ І АХОВЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

*Вучэбная праграма ўстановы адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці паглыбленай вышэйшай адукацыі*
*7-06-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*

2026

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі АСВА 7-06-0322-03-2023 па спецыяльнасці 7-06-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 31.05.2023 №162, вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 7-06-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

**СКЛАДАЛЬНІК:**
*А.Я.Паўлава,* дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*Д.К.Безнюк,* прафесар кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар сацыялагічных навук, прафесар;
*Ю.В.Кавалёва,* вучоны сакратар дзяржаўнай установы «Музей гісторыі горада Мінска», кандыдат культуралогіі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 30.01.2026);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 24.04.2026)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Заканадаўства ў галіне музейнай справы і аховы культурнай спадчыны» прызначана для асваення студэнтамі паглыбленай вышэйшай адукацыі. Вывучэнне тэорыі і практыкі аховы гісторыка-культурнай спадчыны, нацыянальнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь, нарматыўных актаў і міжнародных прававых актаў садзейнічае фарміраванню ўсебакова развітага спецыяліста ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – сфарміраваць у студэнтаў сістэмнае ўяўленне аб заканадаўстве ў галіне музейнай справы і аховы культурнай спадчыны, каб ўпэўнена арыентавацца ў сістэме дзеючага заканадаўства і эфектыўна выкарыстоўваць яго палажэнні ў практычнай прафесійнай дзейнасці.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– фарміраванне комплексу ведаў аб нарматыўна-прававым рэгуляванні сферы музейнай справы і аховы культурнай спадчыны;

– выпрацоўка ўмення аналізаваць нарматыўныя і прававыя акты ў сферы культуры, забяспечваць выкананне заканадаўства ў сферы музейнай дзейнасці і аховы культурнай спадчыны;

– выпрацоўка ўмення прымаць рашэнні і здзяйсняць практычныя дзеянні ў дакладнай адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, арыентавацца ў спецыяльнай літаратуры.

Вучэбная дысцыпліна «Заканадаўства ў галіне музейнай справы і аховы культурнай спадчыны» інтэгруе веды некалькіх гуманітарных дысцыплін і цесна звязана з вучэбнымі дысцыплінамі: «Гісторыя і метадалогія вывучэння культурнай спадчыны», «Актуальныя пытанні музейнай справы», «Музеефікацыя і актуалізацыя культурнай спадчыны».

У ходзе адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць асабісты каштоўнасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, які гатовы да актыўнага ўдзелу ў сацыяльна-культурным жыцці краіны.

*Прадметам* вучэбнай дысцыпліны «Заканадаўства ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны» з'яўляюцца сістэма заканадаўства Рэспублікі Беларусь, дзяржаўнае кіраванне музейнай дзейнасцю і аховай гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь; віды і іерархія нарматыўных і прававых актаў, рэгулюючых дзейнасць музейных устаноў, прававое рэгуляванне міжнароднага супрацоўніцтва

Рэспублікі Беларусь у музейнай сферы, прававое рэгуляванне аўтарскіх праў у музейнай дзейнасці, нарматыўна-прававая і метадычная база дзейнасці музеяў устаноў адукацыі, прававыя асновы дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Заканадаўства ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны» прадугледжана фарміраванне ў студэнтаў наступнай кампетэнцыі: вырашаць прафесійныя задачы ў адпаведнасці з нормамі міжнароднага і айчыннага заканадаўства, маральнымі і этычнымі стандартамі.

У адпаведнасці з патрабаваннямі па выніках засваення вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

*ведаць*:

– асноўныя этапы і крыніцы фарміравання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

– асноўныя прававыя катэгорыі і тэрміны, якія адносяцца да музейнай дзейнасці;

– гісторыю станаўлення заканадаўчай базы ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

– сучасную нарматыўна-прававую базу ў сферы музейнай справы і аховы культурнай спадчыны;

– змест нарматыўна-прававых актаў для ажыццяўлення практычнай арганізацыі дзейнасці ў сферы культуры і музейнай справы.

*умець*:

– выкарыстоўваць вынікі засваення вучэбнай дысцыпліны ў прафесійнай дзейнасці;

– аналізаваць юрыдычныя факты і адносіны, якія ўзнікаюць у сувязі з імі, у сферы музейнай справы і дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

*мець навык*:

– базавымі агульнапрафесійнымі навыкамі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны;

– сучаснымі метадалагічнымі канцэпцыямі аналізу нарматыўна-прававой базы ў сферы музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны;

– навыкамі карыстання нарматыўна-прававой базай у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Заканадаўства ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны» выкарыстоўваюцца сучасныя метады навучання і камп’ютэрныя тэхналогіі.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкарыстоўваецца рэйтынгавая сістэма ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў укараняюцца методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Заканадаўства ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны» ўсяго прадугледжана 144 гадзіны, з якіх 52 – аўдыторных. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 28 гадзін, семінарскія заняткі – 24 гадзіны.

Рэкамендуемая форма правядзення бягучай атэстацыі – вуснае апытанне, тэсціраванне. Рэкамендаваная форма правядзення прамежкавай атэстацыі – экзамен.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны

Змест і мэты вучэбнай дысцыпліны «Заканадаўства ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны». Ахова гісторыка-культурнай спадчыны і музейная справа як напрамак культурнай дзейнасці, што ажыццяўляюцца ў мэтах зберажэння і памнажэння гісторыка-культурнай спадчыны і стварэння ўмоў для яе перадачы наступным пакаленням. Асноўныя прафесійныя і нарматыўныя дэфініцыі ў сферы прававога рэгулявання музейнай дзейнасці і аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Адлюстраванне ў помніках працоўнай дзейнасці чалавека ў розныя эпохі. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб музейнай справе і ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі спецыяльнасці. Агляд дакументальных крыніц і літаратуры па вучэбнай дысцыпліне.

### Раздзел І. Асаблівасці станаўлення і развіцця нарматыўна-прававой базы дзейнасці музеяў Беларусі

### Тэма 1. Гісторыя фарміравання заканадаўчай базы ў галіне музейнай справы ў XX ст.

Праватворчая дзейнасць Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі па ахове помнікаў гісторыі і культуры ў XIX – пачатку XX стагоддзяў. Заканадаўчыя і практычныя асаблівасці забеспячэння аховы царкоўных помнікаў старажытнасці ў XIX – пачатку XX стст.

Савецкае заканадаўства аб культуры і Дэкрэты СНК 1918–1922 гг. аб помніках Рэспублікі і аб забароне вываза і продажу за мяжу прадметаў асаблівага мастацкага і гістарычнага значэння як прававая база нацыяналізацыі і гарантыя захаванасці культурных каштоўнасцяў. Дэкрэты, пастановы СНК і УЦВК аб парадку рэгістрацыі збораў і асобных помнікаў мастацтва і даўніны з мэтай выдзялення прадметаў музейнага значэння і пастаноўкі іх на дзяржаўны ўлік з мэтай аховы. Пастанова СНК БССР «Аб рэгістрацыі, прыёме на ўлік і ахове помнікаў мастацтва, мінулага, побыту і мясцовасцяў прыроды, якія з'яўляюцца ўласнасцю навуковых устаноў і таварыстваў, а таксама прыватных асоб» (1923 г.) як прававая база фарміравання дзяржаўнага Музейнага фонду БССР. Дзяржаўная сістэма аховы культурнай спадчыны на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.

Савецкая праватворчая дзейнасць у галіне аховы помнікаў гісторыі і культуры ў другой палове XX стагоддзя.Пастановы ЦК КПСС і ЦК КПБ як база для стварэння нарматыўна-прававых актаў аб ахове гістарычнай і

культурнай спадчыны, вызначэнні і рэгламентаванні асноўных напрамкаў дзейнасці музейных устаноў у перыяд 1945 – 1991 гг. Тыпавое палажэнне аб музеях Беларускай ССР (1945 г.). Пастанова Савета Міністраў СССР «Аб мерах паляпшэння аховы помнікаў культуры» (1948 г.). Палажэнне аб раённым краязнаўчым музеі ў БССР (1954 г.). «Палажэнне аб Музейным фондзе БССР» (1964 г.). Нарматыўныя дакументы, якія рэгламентавалі парадак камплектавання, уліку і захоўвання фондавых калекцый музеяў у 1945 – 1991 гг. Закон БССР «Аб ахове помнікаў культуры» (1969). Закон БССР «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры» (1978). «Праграма развіцця сеткі дзяржаўных музеяў і філіялаў у БССР да 2000 года» (1989). Дзейнасць Праблемнага савета па пытаннях кансервацыі, рэстаўрацыі і экспанавання музейных калекцый пры Міністэрстве культуры БССР.

## Тэма 2. Дзяржаўнае кіраванне ў сферы культуры. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры

Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы культуры. Паўнамоцтвы Савета Міністраў і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у сферы культуры. Кампетэнцыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў дзяржаўных органаў у сферы культуры.

Праграма развіцця музейнай справы краіны на 2006–2010 гг. Дзяржаўныя праграмы «Культура Беларусі» (2016–2020, 2021–2025), праграмма «Культурная прастора» на 2026–2030 гг. (падпраграмма «Культурная спадчына»), накіраваныя на захаванне і папулярызацыю культурнай спадчыны. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры. Крыніцы фінансавання ў сферы культуры. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25.07.2016 № 289 «Аб парадку фарміравання, фінансавання, выканання і ацэнкі эфектыўнасці рэалізацыі дзяржаўных праграм». Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне ў сферы культуры.

Узаемадзеянне ў сферы культуры дзяржаўных органаў з органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, грамадскімі аб'яднаннямі і іншымі юрыдычнымі асобамі, грамадзянамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Грамадскія назіральныя камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і іншыя кансультатыўныя органы (экспертныя фарміраванні) па пытаннях культуры. Супрацоўніцтва дзяржаўных органаў з камерцыйнымі арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Пагадненні паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь аб супрацоўніцтве ў пытаннях выкарыстання рэсурсаў музеяў краіны ў патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі.

## Тэма 3. Нарматыўна-прававыя асновы дзейнасці музейных устаноў у Рэспубліцы Беларусь

Закон «Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» (рэдакцыі 1996, 2005, 2011гг.). Кодэкс аб культуры Рэспублікі Беларусь як аснова прававога рэгулявання музейнай дзейнасці. Паняцце музейнай дзейнасці. Сістэма дзяржаўных музеяў. Паўнамоцтвы і дзейнасць Рэспубліканскай рады дырэктараў музеяў і Рэспубліканскага навукова-метадычнага савета па пытаннях музейнай справы. Права ўласнасці на музейныя прадметы, прадметы музейнага значэння. Асаблівасці стварэння і ліквідацыі музеяў. Правы і абавязкі музеяў.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 435 «Аб некаторых пытаннях перамяшчэння музейных прадметаў і (або) музейных калекцый праз мяжу Рэспублікі Беларусь» (2006 г.). Палажэнне аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь (рэдакцыі 2006, 2011г.). Палажэнне аб парадку работы наведвальнікаў музеяў з музейнымі прадметамі і (або) музейнымі калекцыямі (2006, 2011 гг.). Палажэнне аб асаблівасцях прававога статусу музея пад адкрытым небам, яго аховы і выкарыстання.

Музейны фонд Рэспублікі Беларусь. Прававыя асновы камплектавання музейнага фонду. Нарматыўнае рэгуляванне ўліку і захавання прадметаў музейнага значэння, музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў. Тыпавая інструкцыя аб парадку ўліку, каталагізацыі, навуковай апрацоўкі і захоўвання музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў. Інструкцыі аб парадку ўліку і інвентарызацыі каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду, якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству культуры арганізацыях.

Прававое рэгуляванне стварэння і адкрыцця пастаянных і часовых экспазіцый. Правілы размяшчэння зброі пры ажыццяўленні дзейнасці, звязанай з калекцыянаваннем і экспанаваннем зброі і боепрыпасаў. Нарматыўнае рэгуляванне экскурсійнага абслугоўвання наведвальнікаў музеяў. Правілы наведвання музейных устаноў Рэспублікі Беларусь. Правы і абавязкі наведвальнікаў музеяў. Доступ і парадак работы наведвальнікаў музеяў з музейнымі прадметамі, навукова-дапаможнымі і сыравіннымі матэрыяламі. Прававое рэгуляванне стварэння і адкрыцця пастаянных і часовых экспазіцый.

Аўтарскае права ў музейнай дзейнасці. Правы на творы мастацтва, перададзеныя аўтарамі ў Музейны фонд. Ліцэнзійны дагавор на выкарыстанне малюнкаў музейных экспанатаў і будынкаў музеяў. Прававыя асновы дзейнасці віртуальных музеяў у Рэспубліцы Беларусь. Прававыя асновы міжнароднага супрацоўніцтва ў музейнай сферы.

Кодэкс музейнай этыкі ІКОМ.

## Раздзел ІІ. Дзяржаўнае кіраванне ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны

### Тэма 4. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны

Заканадаўчыя і нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць ахову гісторыка-культурнай спадчыны. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (1994, 2022). Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» (1992). Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» (2006). Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры (2016). Указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Законы і іншыя кадыфікаваныя нарматыўныя акты. Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Пастановы і загады Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рашэнні органаў мясцовага кіравання і самакіравання, якія рэгулююць пытанні аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Прававая аснова дзейнасці Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады (далей Рада) па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны. Міжнародныя дагаворы, ратыфікаваныя Рэспублікай Беларусь (Дэкларацыі, Канвенцыі, Рэкамендацыі, Хартыі).

### Тэма 5. Дзяржаўны ўлік і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

Вызначэнне паняццяў «культурная спадчына», «гісторыка-культурная спадчына», «культурная каштоўнасць», «гісторыка-культурная каштоўнасць». Класіфікацыя гісторыка-культурных каштоўнасцей: матэрыяльныя і нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Катэгорыі гісторыка-культурных каштоўнасцей. Віды гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (Дзяржспіс). Парадак вылучэння і ўключэння культурных каштоўнасцей, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці ў Дзяржспіс. Структура Дзяржспісу. Пашпарт матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Ахоўныя абавязацельствы. Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь.

Уключэнне гісторыка-культурных каштоўнасцей у Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА. Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва. Беларускія аб'екты, абрады, звычаі, святы і рамёствы ў Спісах сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

## Тэма 6. Увоз і (або) вываз, вяртанне культурных каштоўнасцей

Увоз і (або) вываз, вяртанне культурных каштоўнасцей. Адпаведнасць дзеянняў па перамяшчэнні культурных каштоўнасцей Кодэксу аб культуры Рэспублікі Беларусь і іншым актам заканадаўства аб культуры, заканадаўству аб знешнеэканамічнай дзейнасці, заканадаўству аб мытным рэгуляванні, міжнароднымі дагаворамі. Канвенцыя аб мерах, накіраваных на забарону і папярэджанне незаконнага ўвозу і перадачы правоў уласнасці на культурныя каштоўнасці (1972). Асноўныя падыходы культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь па вяртанні культурнай спадчыны. Палажэнні аб рэстытуцыі культурных каштоўнасцей Беларусі ў «Кодэксе аб культуры Рэспублікі Беларусь аб культуры» (2016). Камісія па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны абарот культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца па-за межамі Беларусі і вынікі яе работы. «Канцэпцыя выяўлення, апісання, уліку і выкарыстання дакументаў па гісторыі і культуры Беларусі, якія захоўваюцца за мяжой». Стварэнне Рэестра нацыянальных культурных каштоўнасцяў, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь.

## Тэма 7. Парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны

Асноўныя парушэнні заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Невыкананне абавязкаў па падпісанні і (або) захаванню патрабаванняў ахоўных абавязацельстваў. Парушэнне парадку і (або) умоў выканання работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях або здзяйсненне дзеянняў, якія ствараюць пагрозу гісторыка-культурным каштоўнасцям. Невяртанне на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці. Прысваенне археалагічных артэфактаў. Парушэнне рэжыму утрымання і (або) выкарыстання зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Парушэнне парадку вайсковых пахаванняў альбо правядзення пошукавых работ. Незаконны пошук і абарот археалагічных аб'ектаў і артэфактаў. Крымінальная адказнасць. Наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне гісторыка-культурных каштоўнасцяў або культурных каштоўнасцяў, якім можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Здзек над гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
### (дзенная форма атрымання адукацыі)

| № раздзела, тэмы | Назвы раздзелаў, тэмы | Колькасць аўдыторных адзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінарскія. заняткі | |
| | Уводзіны | 0,5 | | |
| **I.** | **Раздзел I. Асаблівасці станаўлення і развіцця нарматыўна-прававой базы дзейнасці музеяў Беларусі** | | | |
| 1. | Тэма 1. Гісторыя фарміравання заканадаўчай базы ў галіне музейнай справы ў XX ст. | 1,5 | 2 | Вуснае апытанне |
| 2. | Тэма 2. Дзяржаўнае кіраванне ў сферы культуры. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры | 6 | 4 | Вуснае апытанне, падрыхтоўка рэфератаў |
| 3. | Тэма 3. Нарматыўна-прававыя асновы дзейнасці музейных устаноў у Рэспубліцы Беларусь | 6 | 6 | Вуснае апытанне, падрыхтоўка рэфератаў |
| **II.** | **Раздзел II. Дзяржаўнае кіраванне ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны** | | | |
| 4. | Тэма 4. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны | 6 | 2 | Падрыхтоўка прэзентацый |
| 5. | Тэма 5. Дзяржаўны ўлік і ахова гісторыка-культурнай спадчыны | 4 | 4 | Падрыхтоўка прэзентацый і рэфэратаў |
| 6. | Тэма 6. Увоз і (або) вываз, вяртанне культурных каштоўнасцей | 2 | 4 | Падрыхтоўка прэзентацый і рэфэратаў |
| 7. | Тэма 7. Парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны | 2 | 2 | Вуснае апытанне |
| **Разам** | | **28** | **24** | |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
### (завочная форма атрымання адукацыі)

| № раздзела, тэмы | Назвы раздзелаў, тэмы | Колькасць аўдыторных адзін | | Колькасць гадзін для самастойнага вывучэння |
|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінарскія. заняткі | |
| | Уводзіны | 0.5 | | 2 |
| I. | **Раздзел I. Асаблівасці станаўлення і развіцця нарматыўна-прававой базы дзейнасці музеяў Беларусі** | | | |
| 1 | Тэма 1. Гісторыя фарміравання заканадаўчай базы ў галіне музейнай справы ў XX ст. | | 2 | 4 |
| 2 | Тэма 2. Дзяржаўнае кіраванне ў сферы культуры. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры | 1 | 1 | 8 |
| 3 | Тэма 3. Нарматыўна-прававыя асновы дзейнасці музейных устаноў у Рэспубліцы Беларусь | 1,5 | 1 | 8 |
| II. | **Раздзел II. Дзяржаўнае кіраванне ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны** | | | |
| 4 | Тэма 4. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны | 1,5 | 1 | 6 |
| 5 | Тэма 5. Дзяржаўны ўлік і ахова гісторыка-культурнай спадчыны | 1,5 | 2 | 6 |
| 6 | Тэма 6. Увоз і (або) вываз, вяртанне культурных каштоўнасцей | | 0,5 | 2 |
| 7 | Тэма 7. Парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны | | 0,5 | 2 |
| **Разам** | | **6** | **8** | **38** |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная літаратура*

1. Баринова, Е. Б. Организация работы по хранению музейных предметов и коллекций : учебник и практикум для вузов / Е. Б. Баринова. – Москва : Юрайт, 2022. – 88 с.

2. Богуславский, М. М. Культурные ценности в международном обороте: правовые аспекты / М. М. Богуславский. – 2-е изд., перераб. и доп. – Москва : ИНФРА-М, 2018. – 416 с.

3. Кимеева, Т. И. Комплектование, учет и хранение музейных фондов : учебное пособие / Т. И. Кимеева. – Кемерово : КемГИК, 2022. – 139 с.

4. Кулемзин, А. М. Историко-культурное наследие и общество: теория и методика охраны памятников : учебное пособие / А. М. Кулемзин. – Кемерово : Кемеров. гос. ин-т культуры, 2018. – 147 с.

5. Несцярчук, Л. М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы / Л. М. Несцярук. – Мінск : БелТА, 2003. – 286 с.

*Дадатковая літаратура*

1. Абрамова, П. В. Методика сохранения и актуализации объектов культурного наследия : учебное пособие для вузов / П. В. Абрамова. – 2-е изд. – Москва : Издательство Юрайт, 2023. – 85 с.

2. Вяртанне: Дакументы і архіўныя матэрыялы па праблемах пошуку і вяртання нацыянальных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. – Мінск, 1992. – 256 с.

3. Гужалоўскі, А. А. Гісторыя музейнай справы : вучэб.-метад. дапаможнік для спецыяльнасці перападрыхтоўкі 1-23 02 73 Камунікацыя ў сферы музейнай дзейнасці / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУКМ, 2022. – 228 с. – С. 140–178

4. Клепиков, Н. Е. Памятники истории и культуры Беларуси (конец XVIII – первая треть XX в.): проблемы сохранения / Н. Е. Клепиков. – Минск : Издательский центр БГУ, 2015. – 471 с.

5. Кулемзин, А. М. Памятники истории культуры и их охрана : учебное пособие для вузов / А. М. Кулемзин. – 2-е изд. – Москва : Издательство Юрайт, 2020. – 103 с.

6. Мартыненко, И. Э. Международная и национальные правовые системы охраны историко-культурного наследия государств-участников СНГ : учеб. пособие / И. Э. Мартыненко. – Москва : ИКД «Зерцало-М», 2012. – 943 с.

7. Самусік, А. Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі : вучэбны дапаможнік / А. Ф. Самусік . – Мінск : Экаперспектыва, 2013. – 367 с.

8. Сафонов, А. А. Музейное дело и охрана памятников : учебник и практикум для вузов / А. А. Сафонов. – Москва : Юрайт, 2022. – 330 с.

9. Ходар, Г. М. Ахова нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь: сучасны стан і асноўныя задачы на 2021–2025 гг. / Г. М. Ходар // Культура: открытый формат : Междунар. заочн. научн. конф., Минск, 24 июн. 2021 г. : сб. научн. ст. / Белор. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2022. – С. 293–302.

10. Ходор, Г. Н. Механизмы государственного управления процессами охраны нематериального историко-культурного наследия: опыт Республики Беларусь / Г. Н. Ходор // Сохранение нематериального историко-культурного наследия стран СНГ в контексте глобальных вызовов : Междунар. научн.-практ. семинар, Минск, 15-17 ноя. 2022 г. : сб. научн. ст. / Белор. гос. ун-т культуры и искусств [и др.]. – Минск, 2022. – С. 61–78.

11. Ходор, Г. Н. Подготовка предложений о расширении государственного списка историко-культурных ценностей Республики Беларусь: практические рекомендации / Г. Н. Ходор // Культура Беларуси: реалии современности : VIII Междунар. научн.-практ.я конф., .Минск, 10 окт. 2019 г. : сб. научн. ст. / Белор. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2019. – С. 538–548.

## Характарыстыка рэкамендуемых метадаў выкладання

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Заканадаўства ў галіне музейнай справы і аховы культурнай спадчыны» рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання: лекцыйныя і семінарскія заняткі, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя метады (групавыя дыскусіі, мадэліраванне практычных сітуацый і інш.), візуальныя метады (метады ілюстрацыі, дэманстрацыі, відэаматэрыялаў).

У ліку эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць развіццю крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыя вучэбна-даследчай дзейнасці, ролевага і імітацыйнага мадэлявання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт, вылучаюцца тэхналогіі: праблемнага навучання; развіцця крытычнага мыслення; праектнага навучання; камунікацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый; іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы магістрантаў

Арганізацыя самастойнай работы магістрантаў прадугледжвае падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны, вывучэнне дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўку да заліку і інш.

Самастойная работа магістрантаў накіравана на:

– фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;

– засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;

– развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з’яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама падчас правядзення экзамена.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці магістрантаў

Арганізацыя вучэбнай работы магістрантаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук, аналіз і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне.

Для дыягностыкі атрыманых магістрантамі ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

– вуснае апытанне па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны;

– пісьмовыя работы па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны;

– падрыхтоўка рэфератаў па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны;

– падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны;

– выступленні на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах.

Выніковая ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці прадугледжвае правядзенне экзамену.